# Будучыня нашай сцэны


Падчас узнагароджання пераможцы конкурсу маладых выканаўцаў Данііл Савеня

Безумоўна, галоўная падзея фестывалю - Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні.Сёлета ў ім спаборнічаў 21 артыст.У апошнім туры ўдзельнікі выступалі ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра імя Міхаіла Фінберга пад кіраўніцтвам Максіма Расохі.

Найлепшым прызналі навучэнца Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Данііла Савеню. Ён атрымаў Гран-пры конкурсу і спецыяльны прыз імя Уладзіміра Мулявіна. Перамогу выканаўцу прынеслі песні яго выкладчыцы, кампазітара Алены Атрашкевіч “Жаданая” і “Святая Асветніца”.

Першае месца заняла прадстаўніца Міншчыны Маргарыта Шыбаева. Аляксандр Журовіч з Мінска і Аляксандр Малашэнка з Віцебшчыны - лаўрэаты другой ступені. На трэцім месцы - спявачка з Магілёўскай вобласці Дар’я Часлаўская.

Культура. — 2023. — 17 чэрв. — С. 9.